# ЗМЯНЕННЕ СТАНОВІШЧА КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ПАСЛЯ ПАДЗЕЛАЎ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (да 1830 г.)

**Іваноў Арцём Аляксеевіч**
старшы выкладчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»; магістр гістарычных навук (г. Магілёў, Беларусь)

Не гледзячы на тое, што напрыканцы XVIII ст. на тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага пражывала прыблізна 39% уніятаў і 6,5% праваслаўных, а асноўная частка беларусаў былі ўніятамі, у тым ліку 80% сельскага насельніцтва [1, с. 60], пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі адышло прыкладна каля 100 тыс. каталікоў. Пры гэтым нельга забываць на тое, што, як правіла, прадстаўнікі каталіцкага веравызнання часцяком з'яўляліся найбольш уплывовай, заможнай і аўтарытэтнай часткай грамадства (шляхта і магнатэрыя). Абсалютная большасць мясцовай арыстакратыі і чыноўнікаў былі не толькі рыма-каталіцкага веравызнання, але і, за малым выключэннем, атрымалі польскае выхаванне і адукацыю, і, натуральна, лічылі сябе носьбітамі польска-каталіцкай культуры. На гэтыя абставіны з'явілі ўвагу першыя расійскія чыноўнікі, якія займаліся статыстычнымі даследаваннямі ў краі: "… длительное политическое господство Польши и влияние римо-католичества практически уничтожили в этом регионе национальность древнего русского дворянства, которое уже давно присвоило себе, вместе с Католическим исповеданием, польскую национальность" (цытата па "Этнографический Атлас Западно-Русских



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

губерний и соседних областей. Составлен Р.Ф. Эркертом, действительным членом Императорского русского географического общества, 1863 г.") [2, с. 347].

Указам ад 14 снежня 1772 г. Кацярына II абвясціла аб перадачы ў духоўнае кіраванне каталіцкаму епіскапу ўсіх рымска-каталіцкіх кляштараў і касцёлаў як на далучаных тэрыторыях, так і ў Расіі. Пскоўскі (у гэту губерню ў той час уваходзіла Полаччына) і магілёўскі губернатары павінны былі наглядаць, каб каталіцкія і ўніяцкія епіскапы, канонікі, ксяндзы і іншыя духоўныя асобы не спакушалі праваслаўных да пераходу ў сваё веравызнанне. Гэтым жа ўказам загадвалася, каб папскія булы і распараджэнні былі абкладзены спецыяльным зборам, які ішоў на ўтрыманне клірыкаў.

У 1798 г. зноў былі перагледжаны межы каталіцкіх епархій. Усяго па Расійскай імперыі іх было створана шэсць. Тры з іх — Магілёўская, Мінская і Віленская – ахоплівалі тэрыторыю Беларусі (Магілёўскае каталіцкае архіепіскапства акрамя касцёлаў і кляштараў Беларускай і Кіеўскай губерняў аб'ядноўвала і тыя касцёлы, якія да 1793 г. былі ў межах Расійскай імперыі). У 1804 г. у Магілёўскай епархіі было 159 парафій, 223 936 вернікаў, 78 ксяндзоў, 204 кляштары з 524 [3, с. 22].

Улічваючы прыхаваныя настроі асноўнай часткі каталіцкага духавенства і епіскапату, якія вонкава дэманстравалі сваю палітычную лаяльнасць, урад ўспрымаў "памяркоўнае" каталіцтва ў якасці патэнцыйна небяспечнага, але неабходнага рэлігійнага інстытута, які выконвае важныя сацыяльныя функцыі хрысціянскага выхавання насельніцтва. Палітыка захавання рэлігійнай, культурнай і этнічнай разнастайнасці падданых, заснаваная на "Асноўных законах" і заканадаўстве аб верацярпімасці, якая ажыццяўлялася ў імперыі, у Паўночна-Заходнім краі мела свае асаблівасці. Каталіцкае духавенства настойвала на ўзаемавыключальнай ідэнтычнасці сваёй беларуска-маларасейскай паствы па прынцыпе: "я – каталік, значыць, я – паляк" [4, с. 429].

Пры ўсім разуменні, можна гаварыць аб тым, што становішча каталіцкага касцёла на Беларусі значна пагоршылася толькі пасля паўстання 1831 г. і яго падаўлення (для прыкладу: большасць каталіцкіх манаскіх ордэнаў працягвала сваю дзейнасць на беларускіх землях да 1830 г. Яны мелі свае арганізацыйныя структуры ў межах Расіі і захоўвалі аўтаномію ад улады мясцовых біскупаў [5, с. 116] – як не ўзгадаць пра існаванне на тэрыторыі Расійскай Імперыі іезуітаў, нават пасля іх забароны Ватыканам).

У жніўні 1831 г. магілёўскі губернатар М. Мураўёў падаў Мікалаю I запіску "О ходе мятежа в губерниях от Польши возврашенных и заключення о причинах столь быстрого развития оного". Ён адзначаў, што каталіцкае духавенства было асноўным элементам мяцяжу і прапанаваў перавесці каталікоў з-пад улады Папы рымскага пад уладу імператара. На яго думку, "на якой бы мове ні размаўляў ксёндз, ён усё роўна будзе гаварыць аб вяршэнстве духоўнай улады над свецкай". Камітэт па справах заходніх губерняў 28 лістапада 1831 г прадставіў Мікалаю I даклад па гэтай запісцы. імператар згадзіўся з меркаваннем Мураўёва аб шкодзе, якая наносілася ў сувязі з выхаваннем моладзі каталіцкім духавенствам, але быў супраць прапановы перавесці каталікоў пад сваю юрысдыкцыю, не без падставы баючыся моцнага супраціўлення з боку



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

веруючых, але згадзіўся з неабходнасці скасаваць частку каталіцкіх кляштараў [3, с. 24].

Удзел ксяндзоў і манахаў у паўстанні з'явіўся падставай для адміністрацыйных улад, каб прымяніць да іх прымусовыя меры, распачаць жорскі ўціск. Праз шмат гадоў пасля гэтых падзей магілёўскі архіепіскап, мітрапаліт усіх рымска-каталіцкіх цэркваў Расійскай імперыі граф Шэмбек дасць ім такую ацэнку: "Падзеі 1831 і 1863 гг. парушылі нармальнае цячэнне каталіцкага рэлігійнага жыцця, асабліва ў Паўночна-Заходнім краі. На змену закону прыйшлі адміністрацыйныя распараджэнні, абмежаванні і забаронныя меры, якія нярэдка суправаджаліся цяжкімі спагнаннямі і пакараннямі" [3, с. 63].

Не гледзячы на гэтыя наступствы, каталіцкая царква працягвала граць далёка не апошнюю ролю ў жыцці Паўночна-Заходняга краю. І цяжка не пагадзіцца з тэзісам, што ў XIX ст. творцы беларускасці былі, за рэдкім выключэннем, католікамі, удзельнікамі паўстанняў, людзьмі, моцна звязанымі з польскай культурай і далёкія ад "рускасці" [6, с. 278].

**Літаратура**


1. Рымко, В.Г. Полацкая уніяцкая епархія ў складзе Расійскай імперыі (1772–1832 гг.) / В.Г. Рымко // Религия и общество – 4: актуальные проблемы современного религиоведения: Сб. науч. трудов / Под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2009. – С. 60–62.
2. Пятчыц, А. Пашырэнне праваслаўя ў Беларусі ў сярэдзіне – другой палове XIX ст. / А. Пятчыц // Беларускі Гістарычны Агляд. – Том 7, Сшытак 2 (13). – 2000. – С. 327–350.
3. Грыгор'ева, В.В., Завальнюк, У.М., Навіцкі, У.і., Філатава, А.М. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII – XX ст.) / В.В. Грыгор'ева, У.М. Завальнюк, У.і. Навіцкі, А.М. Філатава. – Мінск: ВП "Экаперспектыва", 1998. – 340 с.
4. Бендин, А. Ю. Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863–1914 гг.) / А. Ю. Бендин. – Минск : БГУ, 2010. – 439 с.
5. Ганчарук, І. Становішча і арганізацыйная структура рымска-каталіцкага касцёла на беларускіх землях у складзе Расейскай імперыі (1772–1830 г.) / І. Ганчарук // Гістарычны альманах – 2002. – Том 6. – С. 97–116.
6. Радзік, Р. Рэлігійныя перадумовы фарміравання беларускай мовы / Р. Радзік // Беларусіка=Albaruthenica: Кн. 2 / Рэд. А Анціпенка і інш. – Мн.: Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны, 1993. – С. 272–279.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова